РАЗДЗЕЛ

II

# ДЗЯРЖАУНАСЦЬ НА БЕЛАРУСК1Х ЗЕМЛЯХ: ТЭАРЭТЫЧНЫЯ I ПСТАРЫЧНЫЯ ПРАБЛЕМЫ

## САБОРНАСЦЬ У ЗАХОДНЯЙ I УСХОДНЯЙ ТРАДЫЦЫЯХ ХРЫСЦ1ЯНСК1Х ДЗЯРЖАУНАСЦЕЙ I ЯЕ УПЛЫУ НА БЕЛАРУСКУЮ ДЗЯРЖАУНАСЦЬ

**С. А. Кал1н1н**

*Беларуси дзяржауны утверётэт*

Сучасныя постсавецкія краіны ужо доУгі час шукаюць найбольш аптымальныя для сябе мадэлі дзяржаунасці і народнага прадстаунщтва. Некаторыя некрытычна запазычылі заходш вопыт, некаторыя спрабуюць звярнуцца да пстарычных традыцый, некаторыя імкнуцца да пэунага сітуатыунага сінтэзу. Але асноунай тэндэнцыяй для усіх з'яуляецца пошук адэкватных для рашэння знешшх і унутраных праблем, адпавядаючых стратэпчным і тактычным мэтам мадэлей прадстаунщтва насельнщтва ва уладзе. На гэта аказвае щск сучасны крытс ліберальных канцэпцый парламентарызму[3; 4; 5], я т я усё роуна прэтэндуюць на статус ушверсальнага способу аргашзацып палітычнай улады народа. Гэта актуалізуе пошук гістарычна альтэрнатыуных ліберальна-парламенцкаму шраванню праектау і высвятленне ступеш іх адэкватнасці для гістарычнай і сучаснай беларускай дзяржаунасці. Адным з ташх праектау расійскага сацыяльна-гуманітарнага дыскурсу, які аказвае вялікі уплыу на Беларусь, з'яуляецца *сабор-насць,* якая мае вельмі шырокае разуменне. У палггыка-прававым разуменні саборнасць звычайна антаганістычна супрацьпастауляецца парламентарызму.

Рашэнне вызначанай праблемы таксама патрабуе распрацоуш адпаведнай метадалогп. Так, зыходным пунктам фарміравання беларускай дзяржаунасці трэба прызнаць яе знаходжанне у лоне хрысщянскай цывілізацыі (першапачаткова - праваслаунай) і адсутнасць прамога (а не асэнсаванага у хрысціянскім асяроддзі) уплыву нехрысщянсшх традыцый антычнасці. Адначасова саборнасць і парламентарызм можна разглядаць як вщавыя праявы родавай катэгорып «спосаб арганізацыі палітычнай улады».

Саборнасць як спроба вырашэння публічных праблем і аргань зацыі улады вядзе пачатак ад царкоунай традыцып, якая Узыходзіць да першага апостальскага Сабору у Іерусаліме (Дзеі 15. 6-31). Гэты Сабор выкарыстау формулу, традыцыйную для пазнейшых саборау, звязаушы волю людзей з воляй Святога Духа («изволися Духу Святому и нам» (Дзеь 15. 28). Ташм чынам, саборнасць ва умх праявах выступае пошукам адзінага і адпавядаючага вышэйшай ісціне рашэння, а не адлюстроувае разнастайнасць штарэсау удзельнікау, што характэрна для пстарычна пазнейшага парламентарызму. Гэта дазваляе вылучаць *царкоунае разумение* саборнасці, рознае у каталіцкім і праваслауным разуменні, што у далейшым прывяло да складання розных традыцый щэальнай дзяржаунасці, якая імкнулася забяспечыць публічны правапарадак і выкананне хрысціянскіх норм.

У праваслаунай эклезіялогіі саборнасць адлюстроувае супрацоунщтва («соработничество») Святога Духа і людзей, разглядаючы Усяленскі Сабор у якасщ вышэйшай шстанцып зямной Царквы. Пры гэтым сам факт Сабора не сведчыць аб яго вышэйшым статусе, бо Сабор мог прызнавацца «Разбойнічым» (Ефескі 449 г.). Такое разуменне саборнасщ не прызнае найгалоунейшым прынцып юрыдычнага універсалізма і у дачыненні да Царквы абгрунтоувае прынцып аутакефаліі («адзінства у любові»). Каталіцкая эклезіялогія падпарадкоувае саборы Рымскаму епіскапу, які прэтэндуе на выключную паунату царкоунай і свецкай улад, пазіцыяніруючы сябе зямной першакрынщай любых улад.

Прэтэнзія Рыма на прыярытэт над свецкай уладай, якой першапачаткова выступала улада Візантыйскага імператара як свецкага уладара Усіх хрысціян, парадзіла *царкоуна-дзяржауную традыцыю* разумення саборнасць Ташм чынам, саборнасць была выкарыстана як прынцып пабудовы публічнай улады, якая прэтэндавала на адпаведнасць хрысщянсшм запаветам. Гэта у перспектыве прывяло да стварэння розных форм дзяржаунасщ, што было абумоулена несупадзеннем базавага культурна-гістарычнага

кантэксту. У Візантыйскай імперыі і шшых праваслауных краінах саборнасць цесна звязвалася з канцэпцыяй «сімфоніі», якая імкнулася да размежавання паунамоцтвау свецкай і сакральнай улад пры іх пастаянным узаемадзеянні і супрацоУніцтве.

Канфлшт Папы і Імператара парадзіу шэраг падзей: дэлегггымізацыя Візантыі у вачах Захаду праз стварэнне Рымскай імперыі германскай нацыі, імператар якой атрымау у спадчыну канфлікт з Папам за уладу; раскол Царквы і сілавыя спробы падпарадкаваць землі праваслаунай традыцыі («вярнуць іх у лона сапрауднага хрысціянства»). У вышку Вялшай Папскай рэвалюцыі (Г. Дж. Берман) папства часова падпарадкавала сабе Ыперскую уладу, але на узроуш асобных каралеуствау выспявала разуменне неабходнасщ абмежавання прэтэнзій Рыма. Гэта парадзша так званы «саборны рух», яш, з аднога боку, спрабавау праз уніі (Ліёнская, Фларэнтыйская) пераадолець раскол (але у заходняй традыцык праз юрыдычнае падпарадкаванне, без вырашэння дагматычных пытанняу), з другога боку, выступау за абмежаванне юрыдычнай улады Папы і рэформу Царквы.

Адначасова у межах саслоуна-прадстаушчай манархіі пачынаецца зараджэнне парламенцкага руху, калі прадстаунікі Усіх саслоуяу дадаткова легітымізуюць каралеускія рашэнні, яшя канфліктуюць з Рымскай царквой. Першыя парламенты не супрацьпастауляюць сябе каралеускай уладзе, а даводзяць да яе патрэбы саслоуяу і падтрымліваюць яе. Гэта дазваляе праводзщь пэуныя паралелі паміж парламентарызмам таго часу і маскоУскімі земсшмі саборамі.

Але у канчатковым вышку карэлюючая з юрыдычным ушверсалізмам дагматычная няздольнасць Рыма прызнаць правамернасць прэтэнзш іншых суб'ектау (бо гэта супярэчыла каталіцкаму разуменню Папы як правапераемшка апостала Пятра[1]) прывяла да чарговага царкоунага расколу (Рэфармацыя), секулярызацыі і пераносу абсалютнай улады Папы на асобу пэунага караля (канцэпцыя суверэнітэту улады). Адначасова абсалютызм каралеускай улады

[1] «Следовательно, если Петр уже на первом этапе был столь нужен Церкви, то тем более он должен быть нужен при отсутствии того фактора единства и устойчивости Церкви, которым являлись Апостолы. Следовательно, в жизни и структуре Церкви постоянно существует потребность в служении Петра. ... Таким образом, Петр со своими особыми полномочиями, полученными от Христа ради их постоянного наличия в церкви, должен иметь законных преемников» [2, С. 139-140].

быу падтрыманы гараджанам^ інтарэсы якіх супярэчы^ саслоунапрадстаунічай структуры грамадства (клірыкі, воіны, трэцяе саслоуе). Але пазней штарэсы гараджан (у першую чаргу жыхароу сталщ), якія не мелі адэкватнага для свайго эканамічнага уплыву прадстаунщтва, уступШ у канфлікт з абсалютнай каралеускай уладай. Гэта прывяло да адмаулення царкоунага разумення саборнасщ як пошуку вышэйшай ^щны і стварэння механізма узгаднення прыватных зямных інтарэсау асобных суб'ектау, што парадзша развіццё фармалізаваных парламенцкіх працэдур.

У вышку Англшская, Амерыканская і Французская рэвалюцыі парадзілі сучасныя мадэлі парламентарызму, калі народ (матэматычная большасць) прэтэндуе на статус вышэйшай крынщы улады. Такая традыцыя парламентарызму карэлюе з ідэаламі рымскага прававога універсалізму і патрабуе рацыянальнага высвятлення вышэйшай крыніцы улады. Усходняя традыцыя была больш арганічнай, юрыдызм змякчауся хрысціянскім веравучэннем. Абмежаванне зямнога (дзяржава і права) Нябесным (царква і рэлігія), спрыяла стварэнню аргашчнай, а не рацыянальна-юрыдычнай ис-тэмы стрымак і супрацьваг, у тым лшу праз апеляцыю да духоунага адзінства людзей.

У Маскоускай дзяржаве саборны рух гістарычна праявіуся у выглядзе Земскіх саборау, яшя прадстаулялі непарыунае адзшства уих саслоуяу. Вялікі князь, а затым цар раіуся з народам, яш, аднак, не выступау за абмежаванне вярхоунай улады і не супрацьпастауляу сябе ёй. Адзначым, што на Маскоускую дзяржаунасць, без сумневу, таксама уплывалі золатаардынскія (мангольскія) традыцып курултаяу (штогодні агляд войска).

Адначасова Маскоусш урад даволі жорстка супрацьстаяу традыцыям самакіравання, якое захавалася на ускрайку дзяржавы, і вечавым традыцыям Ноугарада і Пскова, таму рэтраспектыва звядзення саборнасці да вечавога ладу можа быць адзначана як рамантычная і щэалапчная. Яна мала адпавядае рэчаіснасці, але уяуляе сабой яе светапоглядны зрэз. Апеляцыя да вечавой культуры патрабуе улшу яе адметнасці у розных землях Старажытнай і Сярэдневечнай Русі. Напрыклад, у некаторых веча адыгрывала асноуную ролю, у некаторых збіралася па волі князя або адсутшчала. Факталагічны аналіз доказвае большую аргашчнасць вечавога ладу для пауночнага захаду Старажытнай Русі (кры^чоу).

Пауторны інтарэс да саборнасці узшк у Расіі у 30-х гг. XIX ст. у межах славянафшьства, яшя перанеслі царкоуную катэгорыю

сабориасщ на палггыка-прававую рэча1снасць, у тым лшу Расійскую. Гэта дазволіла супрацьпаставщь заходні парламентарызм халістычнай традыцыі саборнасщ і народнасці, паспрабаваць арганічна звязаць рэча^насць і ідэальнасць. У вышку *славянафЬльская* трактоука саборнасці як больш позш феномен падмяніла сабой ранейшыя праявы саборнасці і стала адным з аргументау крытыкі заходніх ліберальных канцэпцый.

Беларуская дзяржаунасць, якая адчувала уплыу розных традыцый, таксама мела свае спецыфічныя супярэчлівыя спробы арганізацыі палітычнай улады, у тым лшу праз пашырэнне кола суб'ектау улады. Так, у нацыянальнай псторып быу феномен Рады і сеймау. Але характарыстыка іх прыроды праз тэрмшы «парламентарызм» і «саборнасць» патрабуе асцярожнасщ, бо першы адносіцца да больш пазнейшага часу і іншага культурна-пстарычнага асяроддзя, а друп мае шэраг супярэчлівых праяу, з якіх славянафільскае разуменне з'яуляецца найбольш дамшуючым. Пры гэтым для беларускай дзяржаунасщ бы^ больш характэрнымі даунія традыцыі удзелу адносна шырокіх колау і саслоуяу насельніцтва (веча, спецыфічная роля праваслауных епіскапау, больш службовая роля князя). Для Захаду і Усходу (Маскоускай дзяржавы) імкненне да народауладдзя адбывалася (прапаноувалася) як спроба «дэмакратызацыя», адбірання улады у суверэннага адзінага манарха. Беларусь, пападаючы пад уплыу такіх тэндэнцый, усё ж таш трансфармавала адну традыцыю супрацоУніцтва народа і публічных улад на іншую.

Лічым, што гэтае пытанне (як і шшыя дзяржауныя і прававыя рашэнні) трэба разглядаць з боку не пазнейшых юрыдычных тэкстау, а з пазщып выніку узаемадзеяння складаных дынамічных знешніх і унутраных тэндэнцый, яшя прывялі да прыняцця адпаведных дакументау. На наш погляд, патрэба у абмежаванні улады Вялікага князя з боку Рады вынікала з асабістай уни Польшчы і Вялікага Княства. У гэтым разуменш Прывілей 1492 г. выступае спробай магнатау адстаяць нацыянальныя штарэсы, якімі маглі ахвяраваць Ягелоны [1, с. 13-14], імкненнем стварыць пэуную сістэму стрымак і супрацьваг па прычыне няупэуненасці у шчырасщ Гаспадара.

Сейм у Вялікім Княстве і Рэчы Паспалітай меу як станоучыя, так і адмоуныя рысы, якія потым і прывялі да заняпаду і ліквідацыі дзяржаунасщ. Першапачаткова сейм пэуным чынам адпавядау канцэпцыі пошуку ісціны (саборнасці), што юрыдычна было за-

мацавана у прынцыпе Liberum veto, але потым гэты прынцып пры слабасщ каралеускай улады стау зброяй у руках прыватных груповак. На ролю сейма у В я л ^ м Княстве даволі актыуна уплывала тэндэнцыя павышэння ролі дробнай шляхты і заняпаду цэнтральнай улады у Польшчы, што, без сумневу, падагравала штарэсы адпаведных колау у Вялікім Княстве.

Вышэйназванае дазваляе зрабіць вывады аб складанасщ, нелінейнасці шляхоу развіцця дзяржаунасщ як у заходшм, так і Усходнім хрысціянскіх рэгіёнах, паміж якімі адбывауся узаемны уплыу, а пэуныя дзяржауныя і прававыя рашэнні прымал^я, заходзячы не з пэунай канцэпцыі, але з патрэбы рэагавання на пэуную праблему. Беларуская дзяржаунасць у такіх умовах развівалася у падвойна складаных умовах, бо за яе тэрыторыю ішло змаганне Захаду і Усходу. Гэта значыць, што традыцыйна заходнія і Усходнія традыцый у дачыненш да Беларусі адчувалі пэуную трансфармацыю, якая магла іх істотна змяняць або утвараць цікавы незвычайны сінтэз. Парламентарызм і саборнасць у дагматычна ачышчаным выглядзе у гісторыі Беларусі не рэалізаваліся, але пэуныя іх праявы або рэакцыя на іх светапоглядны ціск уключаліся у палггыкаправавое жыццё. Вырашэнне пастауленых праблем, на наш погляд, залежыць ад далейшага паглыблення міждысцыплінарных даследаванняу і распрацоУкі якасна новай навуковай метадалоги.

### *Л***1таратура**


1. *Любая, А. А.* Татарск фактар узаемаадносшау дзяржау Усходняй Еуропы у канцы XV - першай трэц XVI ст.: аутарэф. дыс. ... канд. гіст. навук: 07.00.03 / А. А. Любая; Беларус. дзярж. ун-т. - Мшск, 2009. - 25 с.

2. *Наги, Станислав.* Католическая церковь / Станислав Наги. - Рим; Люблин, 1994. - 280 с.

3. *Crozier, M.* The Crisis of Democracy: Report on the Governability of Democracies to the Trilateral Commission / M. Crozier, Samuel Huntington, Joji Watanuki. - N.-Y., 1975. - 221 p.

4. *Schmitt, K.* The crisis of parliamentary democracy / C. Schmitt ; Transl. by Ellen Kennedy. - Cambridge (Mass.); London : MIT press, Cop. 1985. - 132 c.

5. The Crisis of representative democracy / Intern. progress organization; Ed. by Hans Kochler. - Frankfurt a.M. etc.: Lang, 1987. - 306 c.